База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# Горад пад зямлёй

**Дзе знаходзіцца скарбніца ведаў аб старажытным Гомелі?**

Час распарадзіўся так, што большая час-тка нашага гістарычнага мінулага схавана пад зямлёй ці назаўсёды для нас згублена. На працягу ўжо двух дзесяцігоддзяў на месцы сквера на перакрыжаванні вуліц Пралетарскай і Гагарына археолагі адкры-ваюць рэшткі старажытнага Гомія: ніжнія часткі хат, гаспадарчых пабудоў, знахо-дзяць прадметы побыту і культуры X — XIII стагоддзяў.

Каб згадаць аб старажытным горадзе, Юрый Лупіненка — ганаровы сябра таварыства аматараў гісторыі і археалогіі (ТАмГА), якое дзейнічае на гістарычным факультэце ГДУ імя Ф. Скарыны, распрацаваў праект памятных знакаў. Не так даўно пры добраўпарадкаванні згаданага сквера з’явіўся невялікі насып з каменнай сценкай. На ёй і ўстаноўлены памятныя знакі. Драўляныя разныя дошкі (дарэчы, работа Юрыя Міхайлавіча) сталі ўжо своеасаблівай славутасцю. Прайсці побач і не спыніцца проста немагчыма.

На адной з дошак адлюстравана старонка Іпацьеўскага летапісу, у якім упершыню быў згаданы Гомій пад 1142 годам. На другой адзначана, што “на гэтай мясціне ў X — XIII стагоддзях размяшчаўся пасад старажытнага Гомеля, а ў XVIII — XIX стагоддзях гарадское прадмесце Спасава Слабада”.

Прыемна адзначыць, што размяшчэнне памятных знакаў у гэтым месцы стала стымулам для гараджан у пазнанні гісторыі роднага Гомеля. Людзі спыняюица, задаюць адзін адна-му пытанні... Яны ахутваюцца ў далёкую смугу стагоддзяў. Бо хто ведае, можа дзесьці тут, у тоўшчы зямлі, ляжаць сведкі жыцця іх продкаў. Продкаў, якія праз сівыя і маўклівыя стагоддзіу кажуць ім: “Памятайце і не забывайце...”

P.S. У той час, калі артыкул рыхтаваўся да друку, яшчэ ў адной частцы старога Гэмеля разбіралася брукаванка, якой уXIX — XX стагоддзях былі вымашчаны галоўныя вуліцы і дарожкі ў парку. На жаль, тэта было адзінае і апошняе месца ў Гьмелі, дзе можна было пабачыць цудоўную брукаваную пляцоўку. ЦІ будзе ў нас яшчэ магчымасць пабываць у XIX стагоддзі?..

**Вадзім ЛОСЬ, старшыня таварыства аматараў гісторыі і археалогіі**